СТОУН (Stone) Ірвінг (14.7.1903, г. Сан-Францыска, ЗША — 26.8.1989), амерыканскі пісьменнік; стваральнік новага тыпу б1яграфіі ў амер. л-ры. Скончыў Каліфарнійскі ун-т. Літ. дзейнасць пачаў у 1930-я г. Аўтар раманізаваных біяграфій «Прага да жыцця» (1934, пра В. ван Гога), «Марак у сядле» (1938, пра Дж. Лондана), «Абарона Кларэнс Дэроў» (1941), «Яны таксама балаціраваліся» (1943), «Эл Уорэн» (1948), «Паходжанне. Б1яграф1чны раман пра Ч.Дарвіна» (1980) 1 б1ягр. раманаў «Бессмяротная жонка» (1944), «Праціўнік у доме» (1947), «Жанчына прэзідэнта» (1951), «Каханне вечнае» (1954), «Пакуты і радасці» (1961, пра Мікеланджэла), «Тыя, хто любяць» (1965), «Страсці розуму» (1971, пра З.Фрэйда), «Грэчаскі скарб» (1975) і інш., адметных гіст. і псіхал. дакладнасцю.

Тв. Рус. пер. — Моряк в седле Мн., 1984; Жажда жизни. Мн., 1987; Страсти ума, или Жизнь Фрейда. М., 1999.

Літ. Комаровская Т.Е. Творчество Ирвинга Стоуна. Мн., 1983.

Т.Я.Камароўская.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ